# КАНІКУЛЫ З КНІГАЙ

**6 лістапада ў сярэдняй школе №2 г. Гродна адбылася творчая сустрэча дзіцячай пісьменніцы Ганны Скаржынскай-Савіцкай з вучнямі, якія праводзілі свае восеньскія канікулы ў прышкольным лагеры.**

У пачатку сустрэчы дзеці расказалі пісьменніцы, якія кнігі яны прачыталі за час канікулаў; падзяліліся ўражаннямі ад прачытанага і перажываннямі за сваіх любімых герояў, некаторыя – паказалі малюнкі да сваіх любімых твораў.

Ганна Іосіфаўна пазнаёміла дзяцей з кнігамі “Как ребята Деда Мороза спасали”, “Вавёрчын баравік”, “Надзейка-чарадзейка” і інш., пачытала казкі-чамучкі, а таксама вершы пра восень, канікулы; новыя вершы і апавяданні пра малую радзіму, таму што ў Год малой радзімы пісьменніца не абыходзіць гэтую актуальную тэму.

Асаблівую цікавасць вучняў і не меншую – настаўнікаў, выклікала апошняя кніга “Сказка о волшебном путешествии в мир воды”. У ходзе знаёмства з кнігай пісьменніца разам з гераіняй казкі Чыстай Кропелькай паклікала слухачоў у чароўны свет вады, а Вадазнайка расказаў адкуль ў нашы кватэры паступае вада. У другой частцы казкі Брудная кропелька расказала аб тым, як яна ачышчаецца пасля каналізацыі. Падчас знаёмства з кнігай узнікла шмат пытанняў, на якія пісьменніца адказала, прычатаўшы адрыўкі з казкі.

І дзеці, і настаўнікі былі вельмі ўдзячныя за казку, якая развеяла ўсе сумненні наконт чысціні нашай гродзенскай вады, а гэта яшчэ раз падкрэслівае актуальнасць, каштоўнасць і сацыяльную значнасць праекта Гродзенскага вадаканала.

У канцы сустрэчы дзеці цікавіліся тым, як Ганна Іосіфаўна стала пісьменніцай, над чым працуе цяпер, хто героі яе новых твораў.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

***На фота:*** моманты творчай сустрэчы пісьменніцы Ганны Скаржынскай-Савіцкай з вучнямі СШ №2 г.Гродна.




2018-11-6 10:00






СЕГОДНЯ
В ЛАГЕРЕ